# *РАДЗІМЫ НАШАЙ СВЕТЛАЕ СВЯТА*

**5 ліпеня ў гарадской бібліятэцы № 10 г. Гродна з удзелам аматарскіх творчых калектываў, грамадскіх і ветэранскіх арганізацый горада адсвяткавалі Дзень незалежнасці Беларусі.**



Дзень Незалежнасці для ветэранаў – такое ж важнае свята, як і Дзень Перамогі. І менавіта ім, кавалям і вяршыцелям Незалежнасці – усе словы сардэчнай удзячнасці і пашаны. Адзначыць гэтую вялікую падзею вядомы ў горадзе клуб "Ветэран" пры бібліятэцы № 10 вырашыў у акружэнні лепшых сяброў.

5 ліпеня бібліятэка № 10 сустракала сваіх ганаровых і дарагіх гасцей, прадстаўнікоў такіх творчых калектываў і грамадскіх арганізацый, як Савет Ветэранаў Кастрычніцкага раёна, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Саюз ваенных маракоў, грамадскае аб'яднанне "Русское общество", гродзенскае гарадское літаратурнае аб'яднанне "Надежда", танцавальная група "Вдохновение" і шмат іншых. Сустракалі сяброў па традыцыі патрыятычнымі песнямі ў выкананні вакальнай групы "Родник" клуба "Ветэран" пад кіраўніцтвам падпалкоўніка запасу Анатоля Бяспалава.

Вядучым дадзенага мерапрыемства стаў член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Пётр Сямінскі. Менавіта па яго непаўторнаму сцэнару разварочваліся тэатралізаваныя дзеі вечара, стылізаваныя пад эпоху Давыда Гарадзенскага. Сустракаў гасцей сам Давыд. Спачатку госці пачулі патрыятычныя вершы, напісаныя менавіта да гэтага дня, песню "Люблю цябе, Белая Русь" у выкананні вядучага. Затым вакальная група "Родник" выканала савецкія песні. Кульмінацыяй вечара стала інсталяцыя сустрэчы Давыда Гарадзенскага з закаханай у яго гараднічанкай у выкананні Пятра Сямінскага і Кацярыны Місюкевіч. Вершнік з мячом спяваў песні і чытаў вершы пра Гродна разам са сваёй нарачонай.



Калі на сцэну выйшаў прадстаўнік Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрый Радзівончык, вядомы і любімы гродзенскі паэт з вершам пра малую радзіму, кожны ў зале ганарыўся сваім кутком Беларусі, – так таленавіта кожны радок аўтара перадаваўся залу.

Старшыня Гродзенскага аддзялення рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Русское общество" перадаў ветэранам памятныя значкі, а прадстаўнік Савета Ветэранаў Кастрычніцкага раёна Валянціна Мікалаеўна Гурская са слязамі на вачах віншавала клуб "Ветэран" і ветэранаў з гэтай значнай у іх жыцці і жыцці кожнага падзеяй. Ад Саюза Ваенных маракоў г.Гродна выступіў

добры сябар бібліятэкі падводнік-атамшчык, лектар Саюза – Аляксандр Іванавіч Стацэнка. Наталля Чакліна-Гарбачова чытала свае вершы ў цішы зала, якая звінела ад захаплення.

Улічваючы, што вечар праходзіў напярэдадні свята Купалля, госці з задавальненнем скакалі праз імправізаванае вогнішча Выканання Жаданняў і шукалі Папараць-кветку. І не паверыце – знайшлі! Таму што ў нашым жыцці адбываюцца цуды і чараўніцтва, калі мы разам.

Завяршыла вечар танцавальная група “Вдохновение” з прэм’ерным танцам, які быў падрыхтаваны спецыяльна да свята. На працягу прадстаўлення гучалі вершы ў выкананні Наталлі Чаклінай-Гарбачовай, Святланы Глембоцкай, Дзмітрыя Радзівончыка і іншых. Дзякуй усім сябрам, побач з якімі цяпло і ўтульна! Дзякуй за тое, што разам – мы сіла. А мы РАЗАМ!

***Соф’я ЛІЦВІНЕНКА***

*На фота:* эпізоды святочнай тэатралізаванай дзеі.





